Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛІПЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 128 (27493) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Высветліць, адкуль і навошта прывезены «залаты» прадукт у адзін з супермаркетаў Баранавіч, не ўдалося. Імпарт. Свайго, роднага, беларускага, на базары — еш не хачу. Няма яго толькі ў крамах. СТАР.3

Цяпер Алесь Камоцкі спявае не адзін пад гітару, як раней. Яго канцэрты вельмі разнастайныя. Гэта вам не адна песня з адным сэнсам, як у Стаса Міхайлава... СТАР.5

Распазнаць будучага сямейнага дэспата складана, але магчыма. Калі ён кажа вам: «Я лічу, што жанчына павінна ведаць сваё месца» ці «Я — мужчына і лепш ведаю, што трэба», задумайцеся. СТАР.6

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» — АДЗІН З ДУХОЎНЫХ КАТАЛІЗАТАРАЎ ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА ЕЎРАЗІЙСКАЙ ПРАСТОРЫ»

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 11 ліпеня на адкрыцці XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

«Народжаны на віцебскай зямлі, у сэрцы славянскага свету, наш фестываль выступае захавальнікам духоўнага адзінства шматмільённай сям'і славянскіх народаў, якія з'яўляюцца носьбітамі адной з самых старажытных і багатых культур, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Усім нам, братам-славянам, трэба адраджаць і распаўсюджваць па свеце нашы асноўныя маральныя каштоўнасці: дабро, міласэрнасць, цярпімасць да людзей розных нацыянальнасцей і веры, павагу чалавечай годнасці, непахісныя маральныя прынцыпы і традыцыі».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, фестываль таксама ўносіць сваю дастойную лепту ў рэалізацыю гуманітарнай місіі сучаснага славянства. «Нездарма яго дэвізам з'яўляюцца словы: «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». У гады свайго зараджэння ён стаў часткай той сілы, якая ў пераломны гістарычны перыяд не дала разбурыць векавое братэрства Беларусі, Расіі і Украіны».

«Сёння «Славянскі базар» выступае адным з духоўных каталізатараў інтэграцыйных працэсаў на ўсёй постсавецкай і шырэй — еўразійскай прасторы. У сузор'і міжнародных творчых форумаў ён займае асаблівае месца і з поўным правам мае тытул «фестывалю фестываляў», прадстаўляючы шырокую панараму дасягненняў сусветнай культуры», — падкрэсліў беларускі лідар.

Як адзначыў Прэзідэнт, фестываль з году ў год прырастае дзясяткамі і сотнямі новых сяброў, тут сустракаюцца лаўрэаты «Еўрабачання», «Новай хвалі», Сан-Рэма і іншых фестываляў, пацвярджаючы старажытную як свет ісціну аб тым, што мова песні — гэта мова дружбы, зразумелая без перакладу.

«У гэтым годзе геаграфія фестывалю атрымала планетарны размах, ахапіўшы зямны шар ад Аўстраліі да Кубы і Венесуэлы. Адной з цэнтральных падзей фестывалю стане канцэрт Дружбы, які аб'ядноўвае творчыя сілы розных краін і народаў. А музычныя конкурсы не толькі прадэманструюць захапляльнае спаборніцтва лепшых маладых галасоў планеты, але і ўнясуць свой уклад у выхаванне новага пакалення жыхароў Зямлі ў духу ўзаемнай павагі і даверу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаў упэўненасць, што сваім маштабам, творчай разнастайнасцю, яркім перапляценнем моў і традыцый «Славянскі базар» дапаможа ўнесці дастойны ўклад у прымнажэнне духоўных багацяў нашых краін, захаванне самабытных нацыянальных культур.

Фота Надзеі БУЖАН.

ШЫКОЎНЫ СТАРТ «БАЗАРУ»

Шыкоўна, феерычна, па-еўрапейску... Такімі ўражаннямі дзяліліся тыя, хто ўбачыў у чацвер урачыстае адкрыццё XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Гледачы трансляцыі канцэрта таксама былі здзіўлены: светлавыя эфекты афармлення сцэны насамрэч сёлета сталі прыемным сюрпрызам.

Фестывальны Віцебск яшчэ прыемна здзівіў тым, што сёлета ў дзень старту фэсту не пайшоў дождж. А колькі ўжо гадоў запар стыхія шчыра вітала моцнымі дажджамі гараджан і гасцей фестывальнага Віцебска ў першы «базарны» дзень.

Па традыцыі фэст адкрыў кіраўнік нашай дзяржавы. І зноў жа традыцыйна ўручыў спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Сёлета, нагадаю, лаўрэатам гэтай узнагароды стала Эдзіта Станіславаўна П'еха, народная артыстка СССР, вельмі папулярная савецкая і расійская эстрадная спявачка, актрыса.

У дзень старту фестывалю сумнай «сенсацыяй» на «базары» стала навіна аб тым, што Эдзіта П'еха, падыходзячы да ліфта, падвярнула нагу. З-за надзвычайнага здарэння «базарнага маштабу» нават адмянілі прэс-канферэнцыю з яе ўдзелам. Пра гэта перад пачаткам «зорнай гадзіны» паведаміў Сяргей Шусціцкі, вядучы «зорных гадзін» на «базары». Паводле яго слоў, на той час не было вядома, ці выйдзе П'еха на сцэну Летняга амфітэатра, каб атрымаць узнагароду з рук кіраўніка нашай дзяржавы. Але ж выйшла!

Прэзідэнт, уручаючы ёй узнагароду, пажартаваў, што старшыня Віцебскага аблвыканкама — па спецыяльнасці ўрач-хірург і вылечыць яе да раніцы! І дадаў, што такі інцыдэнт можна лічыць нагодай для таго, каб «базар» запомнілі на ўсё жыццё. Бывала, на фэсце і нагу ламалі. Прэзідэнт меў на ўвазе Мікалая Баскава, які, ходзячы па амфітэатры з вялікай колькасцю кветак у руках, каб павіншаваць гледачоў і падзякаваць за цёплы прыём, зламаў нагу. І нічога сабе. Жывы і здаровы. Уражанняў і цяпер шмат...

Шмат прыемных эмоцый засталося як у тых, хто быў у зале падчас адкрыцця «базару», так і ў тэлегледачоў пасля прагляду канцэрта.

Эмілі дэ Форэст з Даніі — пераможца сёлетняга «Еўрабачання», Аль Бана з Італіі, калектыў «Джыпсі Кінгс» (Францыя) і многія іншыя — насамрэч сёлетні «базар» — фестываль фестываляў. Вельмі спадабалася публіцы ў амфітэатры і тэлегледачам выступленне расійскага цыркача, які на крэслах на сцэне амфітэатра «лёгка» падняўся да сімвала фестывалю — вясілька.

Учора на фэсце быў Дзень саюзнай дзяржавы. А сёння — Дзень моладзі. Сачыце за публікацыямі пра фэст у «Звяздзе».

ГРАН-ПРЫ ДЗІЦЯЧАГА «БАЗАРУ» ПАЕДЗЕ Ў БАЛГАРЫЮ

Гран-пры — 5 тысяч долараў — атрымала прадстаўніца Балгарыі **Прэсіяна Дзімітрава.**

Пра дзяўчынку вядома, што яна нарадзілася ў 2001 годзе, вучыцца ў 4-м класе. Музыкай займаецца па класе фартэпіяна, а таксама вакалам.

З 6 гадоў — салістка дзіцячай вакальнай групы «Сонца» (кіраўнік — доктар музыказнаўства Наталля Канстанцінава).

У 8 гадоў упершыню ўзяла ўдзел у міжнародным конкурсе і адразу заваявала Гран-пры. Гэта была найвышэйшая ўзнагарода міжнароднага конкурсу «Дунай распавядае гісторыю: еўрапейскія легенды» (г. Бухарэст). Уладальніца розных прызоў міжнародных конкурсаў.

Любіць чытаць. Наведвае курс малявання.

1-я прэмія — 3 тысячы долараў — дасталася «зорачцы» пад творчым псеўданімам **Ленка** (Грузія).

2-ю прэмію — 2 тысячы долараў — падзялілі па 1 тысячы. Іх атрымалі **Аляксандра Лакціёнава** з Беларусі і **Арсен Шаўлюк** з Украіны.

І **3-я прэмія** — 1 000 долараў — таксама была падзелена. Яе атрымалі **Галіна Дубок** (Украіна) і **Даяна Кірылава** (Расія).

Спецыяльнымі прызамі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ўзнагароджаны **Апалінарыя** з Беларусі і расіянка **Ксенія Гожа**.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ЗАХАПЛЕННІ

Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы, у захапленні ад убачанага на віцебскім фестывалі мастацтваў.

«Я ў захапленні ад падбору артыстаў, іх выступленняў. Мне вельмі, у прыватнасці, спадабаліся Ланская, Арбакайтэ і іншыя выканаўцы. Ды ўсе, хто выступіў на канцэрце адкрыцця фэсту, мне спадабаліся. Усё было зроблена на самым высокім узроўні. Канцэрт адкрыцця быў неардынарным. Яго не сорамна паказваць па тэлебачанні на ўвесь свет. Спадзяюся, што канцэрт у Дзень саюзнай дзяржавы на «базары» будзе не горшым», — сказаў ён.

Паводле слоў Рыгора Рапоты, Саюзная дзяржава і надалей будзе актыўна падтрымліваць розныя культурныя праекты. У прыватнасці, будзе надрукаваны зборнік апавяданняў беларускіх і расійскіх аўтараў на дзвюх мовах.

Фота БЕЛТА.

А ШКОЛА — ЗНОЎ НЕ ЗА ГАРАМІ...

Пастаянна дзейныя школьныя кірмашы адкрыліся ў мінскіх універмагах і гандлёвых цэнтрах. Дзіцячую вопратку, абутак, вучнёўскую галантарэю, канцылярскія тавары ў максімальна пашыраным асартыменце будуць прадаваць аж да 10 верасня.

УСЕ ІМКНУЦЦА БЫЦЬ АЎТАСЛЕСАРАМІ. А ПАТРАБУЮЦЦА — БУДАЎНІКІ

Самым вялікім попытам у абітурыентаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі сталіцы традыцыйна карыстаюцца прафесіі цырульніка, майстра па манікюру, слесара па рамонце аўтамабіляў, кіроўцы катэгорыі «С», кухара, афіцыянта, памочніка машыніста цеплавоза, правадніка і прадаўца. Затое не без праблем кожны год камплектуюцца групы па такіх запатрабаваных у сталічным рэгіёне спецыяльнасцях, як каменшыкі, тынкоўшчыкі, бетоншчыкі, арматуршчыкі, цесляры, абутнікі.

Усяго сёлета прафесійна-тэхнічныя ўстановы сталіцы гатовы прыняць на навучанне каля 5 тысяч чалавек. Больш як 30% ад планавых лічбаў прыёма прыпадае на падрыхтоўку кадраў для будаўнічай галіны. Прыём заяў распачаўся яшчэ 15 чэрвеня і будзе доўжыцца да 20 жніўня. У выпадку недаўкамплектавання навучальныя ўстановы могуць прадоўжыць прыём дакументаў да сярэдзіны верасня.

Амаль кожны год ва ўстановах прафтэхадукацыі адкрываюцца новыя спецыяльнасці. Не стаў выключэннем і гэты год. Так, у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы гандлю адкрыўся набор на спецыяльнасць «гасцінічная гаспадарка». У Мінскім дзяржаўным прафесійным ліцэі №12 будаўніцтва — на спецыяльнасць «укладчык падлогавых пакрыццяў». У Мінскім прафесійна-тэхнічным каледжы мантажных і пад'ёмна-транспартных работ пачнуць рыхтаваць спецыялістаў па мантажы і эксплуатацыі электраабсталявання, у Мінскім прафесійным ліцэі № 6 прыборабудавання — слесараў-зборшчыкаў бытавой тэхнікі. У Мінскім прафесійна-тэхнічным каледжы будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі аб'яўлены набор на спецыяльнасць «цеплазабеспячэнне, вентыляцыя і ахова паветранага басейна» і «абсталяванне і тэхналогія зварачнай вытворчасці».

Установы прафтэхадукацыі ў пытаннях працаўладкавання супрацоўнічаюць са 147 сталічнымі прадпрыемствамі. У выніку ў арганізацыі прамысловасці размяркоўваюцца 29% выхаванцаў прафтэхустаноў, у сферу будаўніцтва — 32%, сферу паслуг — 24% і ў іншыя галіны — 15% выпускнікоў.

Па стане на 1 верасня 2013 года ў сталіцы будуць дзейнічаць 22 установы прафтэхадукацыі. У выніку рэарганізацыі адбылося аб'яднанне ліцэяў № 1 і № 3, а таксама ліцэяў № 6 і № 9. Гэтыя ўстановы аднапрофільныя, малакамплектныя, у іх адны і тыя ж заказчыкі кадраў, набор ажыццяўляўся на падобныя спецыяльнасці, таму і было прынята рашэнне іх аб'яднаць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:

«Ніякага абвалу беларускага рубля не будзе. Для ажыятажу на валютным рынку няма падстаў. Эканоміка краіны працуе стабільна, золатавалютных рэзерваў у нас дастаткова. Выстройваецца ў чэргі ў абменнікі няма ніякага сэнсу. Мы без праблем зможам забяспечыць патрэбнасці насельніцтва ў замежнай валюце».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.07.2013 г.

Долар ЗША	8820,00	▲
Еўра	11530,00	▲
Рас. руб.	270,00	▼
Укр. грыўня	1081,68	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 22°
Віцебск	+ 22°
Гомель	+ 24°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 21°

КОРАТКА

Вядучая беларуская плыўчыха Аляксандра Герасіменя стала чэмпіёнкай універсіяды ў Казані на дыстанцыі 50 м батэрфляем з рэкордам універсіяды і Беларусі і прынесла зборнай другое золата ў плаванні,

Больш як 24,7 тыс. вакансій налічваецца ў Мінску, з іх 19,2 тыс. — для прадстаўнікоў рабочых прафесій.

Лідскі раён стаў пабрацімам пацярпелага ад мінулагодняй паводкі Крымскага раёна Краснадарскага края.

У Беларусі будаўнічая галіна займае трэцяе месца па колькасці карупцыйных злачынстваў.

На сайце МУС кожны кіроўца цяпер можа даведацца пра парушэнні ПДР. З гэтага часу даведацца пра наяўнасць фактаў перавышэння хуткасці руху, зафіксаваных камерамі фота- і відэафіксацыі, можна ў інтэрнэце на сайце МУС краіны.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ ПАДЛІЧЫЛІ ПРЫБЫТАК АД НАРАДЖЭННЯ ДЗІЦЯЦІ ПРЫНЦА УІЛЬЯМА І КЕЙТ МІДЛТАН

Вялікабрытанія заробіць на папаўненні ў сям'і герцага і герцагіні Кембрыджскіх прыкладна 250 мільёнаў фунтаў. Як адзначылі спецыялісты па рознічным гандлі, часовы ўздым чакаецца ў продажах сувеніраў, тавараў для дзяцей, DVD, кніг і алкаголю. Продаж аднаго толькі спіртнога павінен вырасці на 62 мільёны фунтаў. Акрамя таго, чакаецца, што ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ў Кейт і Уільяма ў краіну прыбудзе вялікая колькасць турыстаў.

АБ'ЕЛІСЯ Ў ПЕРШЫ ДЗЕНЬ РАМАДАНА І ТРАПІЛІ Ў ШПІТАЛЬ

У бальніцы Катара ў першы вечар Рамадана паступілі дзясяткі людзей, у якіх моцна балеў жывот. Па словах мясцовых лекараў, большасць пацыентаў пакутуюць ад абвастрэння гастрыту. У звычайны дзень у Катары такіх хворых набіраецца не больш за паўтары дзясяткі, але з надыходам паста паказчыкі імкліва вырастаюць. Згодна з прадпісаннямі ісламу, на працягу святога месяца Рамадан, які пачаўся 10 ліпеня, людзям забаронена прымаць ежу і піць на працягу светлавога дня. Паесці і здаволіць смагу можна толькі пасля заходу сонца. У сувязі з гэтым медыкі параілі тым, хто посціцца, не пераядаць і імкнуцца стрымліваць свой апетыт.

ФІНСКІ РЫБАК ЗЛАВІЎ ШЧУПАКА З АНДАТРАЙ УНУТРЫ

Мужчына выявіў грызуна, калі ўспароў рыбе бруха. По словах самога рыбака, калі ён рыбачыў на возеры, то бачыў, як драпежнік злавіў ахвяру, але вырашыў, што шчупаку дасталася іншая рыба. Аднак пасля аказалася, што ён праглынуў андатру, якая плавала ў вадаёме. Шчупак не здолеў справіцца з «абедам» і здох. Вядома, што шчупакі могуць вырастаць да паўтара метра і важыць да 35 кілаграмаў. Асабліва вялікія экзэмпляры могуць есці пацукоў, вавёрак, мышэй і птушак, якія пераплываюць вадаём. Шчупак можа праглынуць качку ў перыяд лінькі, але такія выпадкі адбываюцца досыць рэдка.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

З ТУРМЫ НА ВОСТРАВЕ СУМАТРА ЎЦЯКЛІ БОЛЬШ ЗА 100 ЗНЯВОЛЕНЫХ

Не менш за 150 зняволеных уцяклі 11 ліпеня з інданезійскай турмы, размешчанай на востраве Суматра, паведамляе BBC News. Між тым Agence France-Presse паведамляе пра амаль 200 вязняў, якія ўцяклі. Трынаццаць з іх былі асуджаны за тэрарызм.

Па звестках паліцыі, ва ўстанове ўтрымліваецца ўсяго каля 2600 чалавек. Уцёкі адбыліся пасля таго, як у турме пачаліся беспарадкі. Турэмныя чыноўнікі заявілі, што зняволеныя падпалілі турму. Акрамя таго, некаторыя са зняволеных змаглі дастаць зброю, у той час як іншыя закідвалі наглядчыкаў бутэлькамі. Каля 15 службовых асоб былі ўзяты ў заложнікі. Зняволеныя маглі пачаць пратэставаць з-за адключэння электраэнергіі, у выніку якой у турме не было святла, а таксама пачаліся перабоі ў прапампоўцы вады. У аднаўленні кантролю ў турме, а таксама пошукавай аперацыі ўдзельнічаюць каля 700 салдат і супрацоўнікаў паліцыі.

■ На ўсе сто!

МАРАЦЬ — УСЕ, АТРЫМЛІВАЮЦЬ — АДЗІНКІ!

Летняе сонца ўжо грэла напоўніцу і клікала на праменад, але гэтыя дзяўчаты стараліся не паддавацца спакусе. Яны сядзелі за падручнікамі і добрасумленна вывучалі іх змест. Такое магчыма перажыць толькі ў тым выпадку, калі табе выпала паступаць ва ўніверсітэт. Што ж, падрыхтоўка ўжо за плячыма, а недзе сярод самых важных дакументаў чакае свайго часу сертыфікат тэсціравання па беларускай мове з найвышэйшым балам... Пра ўсе сакрэты, цяжкасці і нечаканасці, звязаныя з атрыманнем максімальнага выніку на ЦТ, шчаслівыя ўладальніцы вышэйзгаданых сертыфікатаў расказалі нашаму карэспандэнту. СТАР.3

■ Май на ўвазе!

ФАРЭЛЬ ДА ПРЫЛАЎКАЎ НЕ «ДАПЛЫЛА»

Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні адмовіў у выдачы сертыфіката адпаведнасці на партыі рыбных стэрылізаваных кансерваў у металічных бляшанках, выробленыя ў Расіі.

Канкрэтнае месца вытворчасці названай прадукцыі — вёска Шчыгліца Пскоўскага раёна, вытворца — АТ «Балт-Фіш плюс». У першым выпадку гаворка ідзе амаль пра 50 тысяч бляшанак натуральнай траскі з дабаўленнем алею, у другім — пра партыю амаль з 5 тысяч бляшанак натуральнай фарэлі кавалачкамі. Бляшанкі па 240 грамаў, тэрмін прыдатнасці — па два гады. Абодва віды кансерваў былі выраблены практычна адначасова ў снежні мінулага года.

Сяргей РАСОЛЬКА.